# ПІЛІГРЫМЫ НАДЗЕІ

**Калядная канферэнцыя "У імя міру і дабрабыту", арганізатарам якой выступілі Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-Каталіцкага касцёла ў Беларусі і Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, сабрала ў Нацыянальнай бібліятэцы за круглым сталом прадстаўнікоў розных канфесій, дзяржаўнай улады, грамадскіх арганізацый, дыпламатычных місій, прадпрымальнікаў.**

"Міжканфесійны мір і згода, якія захоўваюцца ў нашай краіне, садзейнічаюць таму, каб Беларусь развівалася паступальна", – упэўнены Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак. Гэта магчыма менавіта таму, што ў нашай краіне не існуе канфліктаў паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў (сёння ў краіне – 25 канфесій і рэлігійных кірункаў). Прычым такая традыцыя фарміравалася на працягу стагоддзяў. У многіх населеных пунктах побач будаваліся касцёлы, праваслаўныя цэрквы, сінагогі, мячэці. У адной сям'і могуць быць і католікі, і праваслаўныя, і гэта, як заўважыў Упаўнаважаны, не перашкаджае людзям, а, наадварот, яднае і ўмацоўвае народ. Канферэнцыя, па яго словах, дала магчымасць абмеркаваць ролю Каталіцкай канфесіі – другой па колькасці вернікаў у нашай краіне. "На працягу стагоддзяў гісторыя каталіцтва цесна звязана з гісторыяй беларускіх зямель, – адзначыў Аляксандр Румак. – У незалежнай Беларусі Рымска-Каталіцкая царква выступае як адзін з духоўных, маральных і сацыяльных арыенціраў нашага грамадства, такім чынам яна адыгрывае ролю ў духоўным адраджэнні грамадства, захаванні гісторыка-духоўнай спадчыны і духоўных каштоўнасцяў беларускага народа. Праз сваё вучэнне яна спрыяе фарміраванню такіх каштоўнасцяў, як любоў, спачуванне, прабачэнне і ўзаемная дапамога, якія з'яўляюцца асновай для мірнага суіснавання".

Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Юзаф Станеўскі перад пачаткам сустрэчы заўважыў, што канферэнцыя ў тым ліку дазваляе падвесці пэўныя вынікі, што неабходна для таго, каб рухацца далей. Прадстаўнікі Каталіцкай царквы гатовы дзяліцца сваім вопытам па рабоце з моладдзю, расказваць пра сацыяльныя праекты, многія з якіх здзяйсняюцца ў рамках праграм такой арганізацыі каталіцкага касцёла як "Карытас". Яе дзейнасць накіравана на падтрымку малазабяспечаных сямей, адзінокіх старых, людзей з абмежаванымі магчымасцямі і тых, хто апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. "Карытас" арганізуе пункты сацыяльнай дапамогі, кансультацыйныя цэнтры і праграмы рэабілітацыі, дапамагае ў развіцці сацыяльных прадпрыемстваў. Такім чынам яна паказвае, што рэлігійныя цэнтры могуць з'яўляцца і сацыяльнымі інстытутамі, якія здольныя паляпшаць якасць жыцця людзей. Безумоўна, дабрачынныя праграмы спрыяюць захаванню веры. Між іншым, з часоў

Таццяна Бузіноўская



пандэміі ўсё больш людзей шукае шлях да Бога. І справа не толькі ў тым, што людзі чакаюць падказак у складаных сітуацыях. Яны бачаць, што будуюцца новыя храмы – і гэта натхняе.

Арцыбіскуп Юзаф Станеўскі заўважыў, што 2025 год Папам Рымскім Францішкам абвешчаны Юбілейным годам Хрысціянства і праходзіць пад дэвізам “Пілігрымы надзеі”: “Гэта асаблівы год, калі трэба яшчэ больш прыкладаць намаганняў, для таго, каб увесь свет жыў у гармоніі і дабрабыце”. Такія каштоўнасці, як мір і дабрабыт, якія абмяркоўваюцца на канферэнцыі, па яго словах, трэба развіваць і прымнажаць. Невыпадкова на сустрэчу запрошаны прадстаўнікі розных канфесій. Як заўважыў Мітрапаліт Станеўскі каштоўнасць свету ў яго разнастайнасці, у той жа час і ў дзяржаве, і ў веры людзі жывуць адной сям’ёй, кіруюцца агульнымі ісцінамі. Каб разумець, ведаць і паважаць адзін аднаго, трэба весці дыялог: “Беларусь – гэта агульны скарб: духоўны, культурны, гістарычны. Мірнае неба над нашай краінай – гэта наша агульная адказ-



theology.bsu.by

насць і наш клопат. Без адзінства не можа быць ні дзяржаўнага жыцця, ні жыцця людзей. Клопаты аб духоўным, культурным і навакольным асяроддзі з’яўляюцца галоўнымі і стратэгічнымі задачамі, бо ад іх залежыць будучыня чалавецтва”.

Дарэчы, у Беларусі склалася добрая традыцыя ўзаемадзеяння паміж прадстаўнікамі розных канфесій. Яны збіраюцца на канферэнцыях, форумах, круглых сталах, абмяркоўваюць важныя для грамадства пытанні, сярод якіх захаванне традыцыйных каштоўнасцяў, інстытута сям’і, выхаванне падрастаючага пакалення, патрыятызм, захаванне памяці пра трагедыі, што адбываліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

“Плённае супрацоўніцтва з’яўляецца прыкладам для іншых краін і рэгіёнаў, паказваючы, як дыялог і сумесныя ініцыятывы здольныя не толькі ўмацоўваць сувязі паміж канфесіямі, але і садзейнічаць агульнаму дабрабыту грамадства. Дзякуючы гэтаму ўзаемадзеянню фарміруецца прастора ўзаемнай павагі, дзе кожная канфесія адчувае сваю значнасць і ўнёсак у пабудову гарманічнай і мірнай будучыні», – адзначыў падчас канферэнцыі біскуп Аляксандр Яшэўскі.

БелТА



Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Юзаф Станеўскі



yurovichi.by

Муфтый Мусульманскага рэлігійнага аб’яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіч, як адзін са старэйшых удзельнікаў Каляднай канферэнцыі, падзяліўся ўласным досведам: “Я – сведка аб’яднання нашай краіны ў 1939 годзе і жахлівых падзей Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннага аднаўлення, калі многія населеныя пункты былі разбураны дашчэнту і іншых гістарычных падзей. Усёй душой адчуваю, што мы павінны абараняць духоўныя культурныя традыцыі ўсіх народаў,

выпрацаваць агульную пазіцыю ў захаванні міру". Да служыцеляў рэлігій, як асоб, якім давяраюць людзі, на яго думку, – асаблівыя патрабаванні. Ён упэўнены, што сёння людская ацэнка за гуманныя дзеянні вельмі значная ў грамадстве, сведчаннем таму з'яўляецца прэмія "За духоўнае адраджэнне".

На канферэнцыі абмяркоўвалася і пытанне сацыяльнай адказнасці бізнесу. У Год добраўпарадкавання, які абвешчаны сёлета ў Беларусі, гэта тэма надзвычай актуальная. Сёння прадпрымальнікі дапамагаюць вяртаць святыні, аднаўляць і рэканструяваць храмы. Яны могуць таксама фінансава падтрымліваць адукацыйныя і сацыяльныя праекты канфесій, культурна-асветніцкія мерапрыемствы, паломніцкія паездкі, царкоўныя бібліятэкі, выданне духоўна-маральнай літаратуры. Як заўважыў Аляксандр Румак, прадпрымальніцтва можа садзейнічаць справе духоўнага адраджэння, развіццю і захаванню духоўных каштоўнасцяў, якія аб'ядноўваюць увесь наш народ.

Падчас канферэнцыі адбылося ўручэнне ўзнагарод за аднаўленне і будаўніцтва новых святыняў у розных гарадах Беларусі. Сярод адзначаных не толькі прадстаўнікі касцёлаў з розных населеных пунктаў Беларусі, але і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Венгерскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь доктар Зіта Ілона Бенчык, прадпрымальнікі, старшыня Каардынацыйнай рады грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый Магілёўскай вобласці Андрэй Нікіцін, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Турчын.

Таццяна **Бузіноўская**